# Раздзел II.

## Назоўнік. Назоўнікі 1-га скланення. Прыназоўнікі. Спражэнне дзеяслова sum у цяперашнім часе абвеснага ладу

**Прачытайце сказы, выпішыце слоўнікавыя формы і вызначце граматычную форму (скланенне, склон, лік) назоўнікаў, перакладзіце сказы.**

***Узор:***

In viis Romae statuae sunt.

**in** (прыназоўнік з *acc./abl.* – у, на)

**vi-is** (via, ae *f,* 1-е скл. – шлях, дарога) – *dat. pl., abl. pl.* (выбіраем *abl. pl.,* так як перад назоўнікам ужыты прыназоўнік, які патрабуе гэты склон)

**Rom-ae** (Roma, ae *f,* 1-е скл. – Рым) – *gen. sg., dat. sg.*

**statu-ae** (statua, ae *f,* 1-е скл. – статуя) – *gen. sg., dat. sg., nom. pl., voc. pl.* (выбіраем *nom. pl.,* так як гэты назоўнік з'яўляецца дзейнікам)

**sunt** (sum, esse – быць) – 3-я асоба *pl.*

На дарогах Рыма ёсць (знаходзяцца) статуі.

10. Diāna et Minerva sunt deae. 11. Historia est schola vitae. 12. In silvis Asiae bestiae et plantae sunt. 13. Britannia est in insŭlā. 14. Amīcae sumus. 15. Filia incŏlae Eurōpae es. 17. Roma est in Italiā. 18. Athēnae sunt in Graeciā. 19. Sine amicitiā non est vita.

amīca, ae *f* сяброўка
amicitia, ae *f* сяброўства
Asia, ae *f* Азія
Athēnae, ārum *f pl. t.* Афіны
bestia, ae *f* жывёла
Britannia, ae *f* Брытанія
dea, ae *f* багіня
Diāna, ae *f* Дыяна
et і
Eurōpa, ae *f* Еўропа
filia, ae *f* дачка
Graecia, ae *f* Грэцыя
historia, ae *f* гісторыя
in (+acc./abl.) у, на
incŏla, ae *m* жыхар
insŭla, ae *f* востраў
Italia, ae *f* Італія
lingua, ae *f* мова
Minerva, ae *f* Мінерва
non не
planta, ae *f* расліна
Roma, ae *f* Рым
schola, ae *f* школа
silva, ae *f* лес
sine (+abl.) без
sum, esse быць
vita, ae *f* жыццё